УДК 882.6.09

# "МНЕ СОНЦАМ СВЕЦІЦЬ НАДНЯМОННЕ": КАНЦЭПТ "РОДНЫ КУТ" У ТВОРАХ ЯКУБА КОЛАСА І МІКОЛЫ МАЛЯЎКІ

Несцяровіч Вольга Барысаўна
дацэнт кафедры рускай мовы як замежнай установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў";
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Мінск, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны паэтычнаму ўвасабленню канцэпта "родны кут" у творах народнага паэта Беларусі Якуба Коласа і яго вядомага паэта-земляка Міколы Маляўкі. Даследуецца тэма малой радзімы, паэтычнае стаўленне да роднай зямлі, творчасць паэтаў аб'ядноўвае шчырая любоў да роднага кута, які кожны з іх не мае сілы забыць.*

Для кожнага чалавека Радзіма – святыня, дадзеная нам Богам. Яе не выбіраюць, не мяняюць, а любяць і паважаюць, як родную маці. Няма больш святой любові, чым любоў да роднай зямлі. Нямала твораў прысвечана Мікалаеўшчыне, малой радзіме Якуба Коласа. З гэтай вёскі, што размясцілася ля берагоў Нёмана, родам многія беларускія паэты. У слаўнай кагорце значнае месца належыць Міколу Маляўку. Паэтзвяртаецца ў сваёй творчасці да вёскі маленства, нават асобную кнігу паэзіі прысвяціў ёй – "Старая зямля" – і самой назвай кнігізасведчыў, наколькі яму блізкая Мікалаеўшчына – "Наднямоння мілая прастора".

У кнігу "Старая зямля" ўвайшло трыста тры санеты і дзве вершаваныя ўстаўкі, сабраныя разам, у часавай паслядоўнасці, яны ператвараюцца ў строфы паэмы, прысвечанай роднай Мікалаеўшчыне. Да вескі Мікалаеўшчына быў прыпісаны і засценак Акінчыцы, дзе ў 1882 годзе ў сям'і лесніка нарадзіўся Канстанцін Міцкевіч – будучы народны паэт Беларусі Якуб Колас.

Прататыпам лірычнага героя "Старой зямлі" з'яўляецца сам аўтар. Надзелены пяшчотнай і ўражлівай душой, назіральны чалавек, якога цікавіць усё, што адбываецца і ў свеце, і на роднай зямлі, у горадзе, і ў вёсцы, герой кнігі Міколы Маляўкі знаёміць з незабыўнымі і дарагімі мясцінамі, дае параду: "*Бяры да Мікалаеўшчыны білет – / І сон дакументальнай явай стане.*" [4, с. 6].

Нёман "працякае" праз усю кнігу Міколы Маляўкі. і "ціха дыхае пад кручай, спакоем жывіць, сілаю гаючай", і, бывае, у паводку выходзіць з берагоў, шуміць, бунтуе, "морам стаўшы нечакана". *"Лячу душою я, зямляк далёкі, / Да вас, Альбуць, Ласток, Канцывалокі, / Дуброўскі, Смольня, Клешчыцы, Маргі – / Куточкі лесавыя, палявыя: / Да радасці маёй, маёй тугі / Даўно вы – ілюстрацыі жывыя"* [4, с.131] , – піша Мікола Маляўка ў кнізе "Старая зямля".

Без Нёмана цяжка ўявіць паэзію Міколы Маляўкі. Родная рака, якая берагамі сваімі падыходзіць да самага паэтавага агарода, не можа заставацца нейкім пабочным вобразам. Вакол яе часта клубкуюцца самыя шчырыя пачуцці і адчуванні, з Нёманам паэт часта звярае сваю паэтычную памяць.

Радуе і хвалюе душу паэта раслінны свет прынёманскага краю і самой Мікалаеўшчыны – ясені, бярозы, ліпы ўздоўж вуліцы і вакол школы. і за кожнай хатай – сады: *"Лячу сваю вясковую душу / Зялёным лісцем і травой зялёнай"* [4, с.74].

Пра дзесяткі лёсаў сваіх землякоў паэт расказаў у кнізе "Старая зямля": *"Радкі збіраў я сэрцам і душой / Як кветкі, рассыпаліся санеты"* [4, с. 309].

Мікола Маляўка лічыць дні, каб хутчэй вярнуцца ў "хату з матчынай душою". У родных мясцінах прыгажосць на кожным кроку: не толькі ў садзе, лесе, на Нёмане, які ў засуш пакінуў старое рэчышча і праклаў сабе новае, але і ў хаце. Зімою мароз на вокнах малюе свае палотны, ператвараючы іх у карцінныя галерэі. А вясною маці дастае з куфра свой "кужэльны скарб", які выносіць з хаты і прасушвае на сонцы, ствараючы рукатворны кветнік, і над гэтым скарбам, шукаючы нектар, "кружыцца пчолка залатая".

Вобразы ў Міколы Маляўкі хоць і някідкія, але яны заўсёды напоўненыя незвычайным душэўным цяплом, пяшчотаю і спагадай. Вішнёвы лісток, прыбіты дажджом да шыбіны, убачаны і данесены да нас паэтам, не здольны ўскалыхнуць зямлю падобна землятрусу, але ён можа глыбока ўскалыхнуць душу чалавека. "Лісток вішнёвы" – так паэт назваў раздзел, якім адкрываецца кніга "Дзічка ў полі". Тут не толькі шмат назіранняў з жыцця, прысвячэнняў знаёмым і блізкім людзям, але і роздум над перажытым, пабачаным на далёкіх і блізкіх дарогах.Часам герой вершаў пачуваецца птахам, што вярнуўся з выраю і ўсё даўно знаёмае адкрывае для сябе па-новаму. Непрытворнай спавядальнасцю заўсёды вылучаецца паэзія Міколы Маляўкі. Вось характэрныя радкі:

*Вярнуўся з выраю, здарожаны,*
*Над ціхім Нёманам стаю –*
*І адкрываю зноў прыгожую*
*Зямлю сваю.*
*Цудоўны край! І людзі шчырыя!*
*А я, наіўны чалавек,*
*Усё жыццё шукаў у выраі*
*Малочных рэк.* [3, с. 102]

Кожным вершам сваім паэт нібы звяртаецца да роднай зямлі, яшчэ раз падкрэсліваючы сваю непарыўную еднасць з ёй. Зямля стала найгалоўнейшым вобразам у творчасці Міколы Маляўкі. Зямля гэтая хоць і мае планетарныя маштабы, вельмі часта звужаецца да памераў роднага поля з сімвалічнай дзічкай у ім, а то і роднага горада, дзе ўжо можна вельмі дакладна праз павелічальнае шкло памяці разгледзець кожную драбнічку – ад травінкі да мураша. Урэшце, зямля для аўтара – не толькі паэтычны вобраз, а яшчэ і яго духоўнае багацце:

*З табой, зямля мая, у згодзе*
*На родным лецішчы жыву –*
*І пакладу на веку сходе*
*Узгорак твой пад галаву.* [3, с. 7]

Учытваешся ў лепшыя вершы Міколы Маляўкі і разумееш, што гэта не проста паэтычныя творы, а значныя філасофскія абагульненні:

*Бяроз асенніх залацяцца свечкі*
*Ў надрэчным гаі,*
*Як у храме вечным.*
*Я ў храме гэтым вернік не чужы:*
*Гляджу на свет*
*Вясёлкава-блакітны –*
*І нараджаюцца ў маёй душы*
*Не проста вершы, а радкі малітвы.* [3, с. 233]

"Радкі малітвы" гучаць у храме паэзіі Міколы Маляўкі – малітвы за свой край, за блізкіх сэрцу землякоў з вёскі Мікалаеўшчына.

У творчасці паэта перасякаюцца дакладнае адлюстраванне рэчаіснасці і імкненне эмацыянальна ўздзейнічаць на яе, у выніку ўзнікае мастацкі свет са сваімі рытмамі, сімваламі, метафарамі, спалучэннем гукаў і вобразаў.

"Малюнкі родныя і з'явы", прырода роднага краю для герояў Якуба Коласа – "жыцця крыніца", крыніца радасці і натхнення, гаючая сіла, што таксама, як і плён працы, "цешыць душу леснікову". Ніхто так, як Якуб Колас, з такой мастацкай сілай не паказаў гармонію чалавека і прыроды. "Прырода з людзьмі жыве супольна", – падкрэслівае паэт:

*Эх, час касьбы, вясёлы час!*
*І я ім цешыўся не раз.*
*і з таго часу па сягоння*
*Мне сонцам свеціць Наднямонне!* [2, с. 221]



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Якуб Колас сцвярджае думку, што “родны кут – гэта не толькі месца нараджэння твайго, але і тая вечна празрыстая ключавая крыніца”, што наталяе душу чалавека, дае яму вечныя духоўныя арыенціры, сілы любіць свой родны кут, сваю Радзіму.

“Бацька-Нёман” даўно стаў паэтычным вобразам нашага краю. У Якуба Коласа Нёман зусім свой, змалку зведаны і абжыты, таму паэтызуецца з асаблівай цеплынёю і сардэчнасцю.

*Эх, зараслі вы, пуцявіны,*
*У гэты мілы мой куточак...*
*Над самым Нёмнам срэбраводным,*
*Так сэрцу блізкім-блізкім, родным* [2, с. 142].

Паэтызуючы Нёман, Якуб Колас не карыстаецца экспрэсіўнымі сродкамі характарыстыкі: яны простыя, эмацыйна стрыманыя. Нёман у творах *“светлы”*, *“поўнысілы і красы”*, *“родны”*, *“сэрцу блізкі-блізкі”*, *«свободны»*, *“штукар і сваволнік”*.

Яшчэ ў “Новай зямлі”, у раздзеле «*Летнім часам*» любоў да Нёмана прарываецца ў зрушанымі словамі захаплення:

*Ідзе на свецеёсць такая,*
*Як Нёман, рэчанька другая?*
*Тут хвалі светлы, срэбралітны,*
*А беражкі – ну, аксамітны...*
*У воду войдзеш –шчасце раю...* [2, с. 223].

“Мой родны кут, як ты мне мілы...” – гэта не просты зачын паэмы “Новая зямля”, гэта светлы скразны матыў твора. Родны кут для героя Якуба Коласа мілы, дарагі:*“Добра мне тут, мне тут міла, / Родна ўсё і блізка, / Тут хлябок мой, мая хата / І мая калыска”* [2, с. 207].

Любаванне краявідамі радзімы выклікае ў паэтаўЯкуба Коласа і Міколы Маляўкі адчуванне радасці, асалоды, райскага хараства, сапраўднага свята. “Родны кут”, сонечнае Наднямонне – абжытая прастора, дзе пачуваецца па-хатняму ўтульна і светла.Да малой радзімы – Мікалаеўшчыны –вяртаюцца паэты ў творах,кабне раз у стоеным любаванні пакланіцца роднай зямлі – калысцы свайго жыцця і паэзіі.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Гачев, Г. Д. Национальные образы мира / Г. Д. Гачев. – М. : Академический проект, 2007. – 512 с.
2. Колас, Я. Збор твораў: у 20 т. Т. 8. Паэма “Новая зямля” / Якуб Колас ; рэд. тома М.І. Мушынскі ; падрыхт. тэкстаў і камент. Э.А. Золавай ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 347 с.
3. Маляўка, М. “Дзічка ў полі” / М. Маляўка. – Мінск : Паліграфкамбінат імя Я. Коласа, 2007. – 273 с.
4. Маляўка, М. “Старая зямля: санеты, спавітыя дзеразой” / М. Маляўка. – Мінск: Паліграфкамбінат імя Я. Коласа, 2005. – 368 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова